Жыві, Беларусь!

Народная Газета

Орган Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

№ 220 (233) 13 лістапада 1991 г. Серада.

ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1990 ГОДА НА БЕЛАРУСКАЙ І РУСКАЙ МОВАХ.

Кошт: у розніцу — 10 кап. падпісны — 3 кап.

Факты Аргументы Комментарии Суждения

Вкратце

✦ Украина планирует в ближайшее время учредить свою собственную валюту. На начальном этапе перехода к «полному экономическому суверенитету» с января 1992 года в республике будет действовать система так называемых купонов, которые заменят советские рубли.

✦ Руководство Молдовы не возражает против того, чтобы юноши из республики служили по контракту в Советской Армии и Военно-Морском Флоте.

✦ Национальные Олимпийские комитеты трех новых балтийских государств теперь уже и формально признаны международным Олимпийским комитетом.

✦ Высокопоставленные представители семи ведущих индустриальных стран Запада в частном порядке договорились оказать финансовую помощь СССР, которая состоит в том, что предоставится «отсрочка» в выплате процентов по долгам. Как считают эксперты, это самый эффективный способ спасти СССР в нынешней ситуации, когда в стране остро не хватает твердой валюты.

Край брокеров и голубых озер?

Одна из крупнейших за всю историю республиканского бизнеса сделок зарегистрирована на недавних торгах, которые проводила Белорусская универсальная биржа. Сто тысяч тонн тюменской нефти продали здесь за 120 миллионов рублей.

Ирина ФЕДОРОВА

Огород Вани Солнцева

О Ване Солнцеве знает, наверное, и стар и млад, но о сегодняшних перипетиях жизни главного героя книги В. Катаева «Сын полка» мало кому известно.

Сообщаем, что Герой Советского Союза Иван Георгиевич Солнцев после отчаянных героических усилий преодолел наконец родной чиновничий бюрократизм. Более полугода бился ветеран войны и труда над разрешением простейшей проблемы — получения земли под огород в одном из подмосковных районов.

Местные чиновники волокитили это дело, пока не вмешался аж первый заместитель председателя Мособлсовета. Теперь у Вани Солнцева появилась возможность выращивать на пропитание свой картофель. Герои книг тоже хотят есть.

Леонид ФАДЕЕВ.

Любовь до гроба?

Житель деревни Лозицы Малоритского района Анатолий Д. на беду обнаружил в постели своей жены... мужчину.

Это, увы, не начало анекдота, это быль и далеко не смешная: выстрелом из охотничьего ружья любовник был застрелен. Затем муж вознамерился закопать жертву, но сделать этого не успел и был взят. Убийца приговорен к семи годам отбывания в колонии усиленного режима.

Еще одна нелепая смерть зафиксирована в Кобрине. 35-летний В. в состоянии опьянения сорвался с балкона четвертого этажа, пытаясь проникнуть в квартиру бывшей жены.

Василий САРЫЧЕВ.

Один в высшей школе не воин?

В знак протеста против невнимания парламента республики к проблемам высшего образования старший преподаватель БГУ имени В. И. Ленина Константин Лапко провел однодневную предупредительную забастовку в стенах своей «альма матер».

Впрочем, помимо экономических требований — повысить зарплату преподавателям вузов не менее чем в два раза, улучшить материальную базу высшей школы республики, — Константин Лапко выдвинул и ряд политических «ультиматумов». В своем открытом письме депутатам Верховного Совета Беларуси он, к примеру, потребовал национализации имущества КПБ—КПСС, отставки Совета Министров республики и самороспуска парламента.

Кроме того, Константин Лапко предложил народным избранникам принять постановление, запрещающее занимать административные должности лицам старше 60 лет, а также совмещать два руководящих поста на срок более 2 месяцев.

Кстати, почти год назад Константин Лапко проводил голодовку протеста против катастрофического состояния системы образования Беларуси. Но тогда парламент так и не внял требованиям голодающего. Даст ли результат новый метод борьбы?

Николай ДЕБЕЛО.

Не хватает рублей, помогут доллары

МИНСК. **Правление Белорусского детского фонда и Христианского детского фонда (штаб-квартира в г. Ричмонде) договорились о проведении благотворительной акции — международном спонсорстве.**

От белорусской стороны требуется до 1 января 1992 года отправить в адрес ХДФ тысячу заполненных анкет на белорусских детей (сирот, находящихся под опекой, из многодетных семей, чернобыльской зоны и др.). ХДФ же берется найти каждому ребенку конкретного спонсора, который бы, согласно положению о международном спонсорстве, мог бы выплачивать подопечному по 21 доллару ежемесячно.

Юрий НОЯРОВИЧ.



Рисунок Олега ПОПОВА.

«Горячий» телефон 32-24-02 работает ежедневно с 9 до 11 часов.

Беларусь — Азербайджан

Усе флагі ў госці...

У апошні час Дом знешнеэканамічных сувязей, што па Вайсковым завулку беларускай сталіцы, жыве даволі напружаным жыццём. Гэты галоўны будынак урадавай рэзідэнцыі звычайна пуставаў у чаканні самых высокіх гасцей. Зараз жа сітуацыя карэнным чынам змянілася. Менавіта тут ідзе напружаная работа па пошуку шляхоў выйсця з экстрэмальнай эканамічнай сітуацыі, наладжванню гарызантальных сувязей з самымі рознымі партнёрамі, пачынаючы ад кіраўнікоў суверэнных дзяржаў і заканчваючы прадстаўнікамі мноства замежных фірм.

Учора над парадным уваходам Дома знешнеэканамічных сувязей, бадай, упершыню з'явіліся флагі дзвюх суверэнных дзяржаў — Азербайджана і Беларусі. У сярэдзіне дня Старшыня Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслаў Шушкевіч і Прэзідэнт Азербайджанскай рэспублікі Аяз Муталібаў змацавалі сваімі подпісамі дагавор паміж нашымі дзяржавамі. Выказваючы волю народаў і іх рашучасць пабудаваць дэмакратычныя прававыя дзяржавы ў Рэспубліцы Беларусь і Азербайджанскай рэспубліцы, абедзве рэспублікі перакананы ў неабходнасці развіваць свае міждзяржаўныя адносіны на аснове прынцыпаў суверэннай роўнасці, неўмяшання ва ўнутраныя справы, адмовы ад прымянення сілы, эканамічных і любых іншых метадаў ціску, урэгулявання спрэчных праблем пагаджальнымі сродкамі, а таксама іншых агульнапрызнаных прынцыпаў і норм міжнароднага права.



НА ЗДЫМКУ: у час падпісання дагавора.

Што галоўнае ў гэтым важным палітычным дакуменце? Перш-наперш абодва бакі прызнаюць адзін аднаго суверэннымі дзяржавамі і абавязваюцца ўстрымлівацца ад дзеянняў, якія могуць нанесці ўрон іх дзяржаўнаму суверэнітэту.

Абедзве рэспублікі абменьваюцца паўнамоцнымі прадстаўніцтвамі. Іх статут будзе ўрэгуляваны спецыяльным пагадненнем.

Дагавор заключаецца тэрмінам на 10 гадоў. Ён складаецца з 21 артыкула. Уступіць у сілу пасля абмену ратыфікацыйнымі граматамі, які адбудзецца ў горадзе Баку.

Як адзначыў на прэс-канферэнцыі Прэзідэнт Азербайджанскай рэспублікі Аяз Муталібаў, ён адчувае вялікае задавальненне ў сувязі з падпісаннем гэтага важнага гістарычнага дакумента. Прэзідэнт бачыць вялікую будучыню ў развіцці нашых узаемаадносін. Абедзве рэспублікі дамовіліся развіваць раўнапраўнае і ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва сваіх народаў і дзяржаў у галіне палітыкі, эканомікі, адукацыі і культуры, аховы здароўя, экалогіі, навукі, тэхнікі, гандлю, у гуманітарнай і іншых галінах, садзейнічаць шырокаму інфармацыйнаму абмену.

Як пацверджаннем гэтага стала пагадненне паміж урадамі Азербайджанскай рэспублікі і Рэспублікі Беларусь аб прынцыпах гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, якое падпісалі прэм'ер-міністр Азербайджанскай рэспублікі Гасан Гасанаў і Старшыня Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь Вячаслаў Кебіч. Абодва бакі дамовіліся на ўзроўні ўрадаў рэгуляваць пастаўкі найважнейшых відаў прадукцыі. Яны даручаюць сваім эканамічным органам, міністэрствам і ведамствам узгадніць наменклатуру і ўзаемна збалансаваныя аб'ёмы гэтай прадукцыі. Да 25 лістапада гэтага года будуць падпісаны адпаведныя дадаткі да пагаднення. Адзначым, што Беларусь штогод адгружае спажыўцам Азербайджана прадукцыі вытворча - тэхнічнага прызначэння і тавараў народнага спажывання больш чым на 308 мільёнаў рублёў. У сваю чаргу сонечная рэспубліка пастаўляе для патрэб Беларусі прадукцыі і тавараў на суму больш як 264 мільёны рублёў. Дарэчы, гэтую «вілку» плануецца як мага хутчэй звесці да нуля.

Сёння Азербайджан пастаўляе нам сталёвыя трубы, пракат каляровых металаў, пластмасы, сінтэтычны каўчук, электрарухавікі і трансфарматары, будаўнічыя матэрыялы і харчовыя тавары. На берагі Каспійскага мора паступаюць ад нас грузавыя аўтамабілі, прычэпы, трактары, поліэтылен, хімічная і лакафарбавая прадукцыя, ліфты пасажырскія, папера, тканіны ўсіх відаў, тэлевізары, магнітафоны, халадзільнікі, дываны і г. д.

Адна з галоўных думак, якая прагучала ў час прэс-канферэнцыі, была такая: ва ўмовах складанай абстаноўкі як у краіне ў цэлым, так і паміж рэспублікамі нам неабходна з разуменнем ставіцца да патрэб адзін аднаго, знаходзіць магчымасці і шлях аказання ўзаемнай дапамогі.

Высокія госці з Азербайджана сёння адбываюць на радзіму. А заўтра над парадным уваходам Дома знешнеэканамічных сувязей павінен з'явіцца флаг яшчэ адной суверэннай дзяржавы...

Валерый ДРАЗДОЎ, аглядальнік «Народнай газеты» па пытаннях дзейнасці ўрада.

На сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь

Праект Канстытуцыі ёсць, цяпер самая пара думаць пра ўласныя кватэры

Вечарам у панядзелак дэпутаты знайшлі шлях да ўзаемаразумення. Толькі ў кулуарах можна было пачуць абурэнне накшталт таго, што гэта дзікунства нейкае, а не праект Канстытуцыі, дзе аўтары такія словы, як «стараста», «войт» выкапалі, мы (мелася на ўвазе камуністычная большасць) ўжо зусім сябе паважаць пераcталі... У рэшце рэшт Вярхоўны Савет не браў на сябе, па сутнасці, ніякай адказнасці — проста праект з усімі супярэчнасцямі будзе абнародаваны для абмеркавання.

Цікава заўважыць, што Станіслаў Шушкевіч недвухсэнсоўна выказаў свае адносіны да прэзідэнцкай формы праўлення: «Як Старшыня Вярхоўнага Савета я не адчуваю нейкага недахопу ўлады, недахопу паразумення з урадам... Я проста вам тлумачу, хаця раней мне казалася, што гэта катэгарычная прэзідэнцкая ўлада вельмі патрэбна».

Адны, як Станіслаў Станіслававіч, перагледзелі свой погляд, другія бачаць вострую неабходнасць у новай дзяржаўнай пасадзе. Здаецца, у Беларусі ёсць магчымасць пайсці сваім шляхам, не капіруючы развіццё падзей у Расіі, на Украіне, Малдове і г. д. Па меншай меры кожны з нас зможа выказаць свае адносіны да пераўтварэння сістэмы ўлады.

Сёмы пункт парадку дня — законапраект аб інвалідах. Было прыемна чуць з вуснаў старшыні пастаяннай камісіі Яўгена Жуковіча, што беларускі парламент у вырашэнні праблем знявечаных людзей далёка апераджае парламенты былых саюзных рэспублік. Гэта дае шанц на сацыяльную абарону кожнаму, хто трапіць у бяду, колькасць жа інвалідаў, на вялікі жаль, рэзка павялічваецца за кошт ахвяр злачынстваў, аўтамабільных аварый, вытворчых траўм, службы ў арміі. Нельга забывацца і пра нервовыя парушэнні, радыяцыйнае забруджванне ад чарнобыльскай катастрофы.

Усе артыкулы, што так ці інакш абаранялі інвалідаў, не выклікалі спрэчак. Пярэчанні выклікала квота (па аднаму прадстаўніку) пры выбарах у Вярхоўны Савет і мясцовыя Саветы для таварыстваў інвалідаў, глухіх, інвалідаў па зроку. Цяпер гэтыя грамадскія фарміраванні маюць у парламенце 21 прадстаўніка.

Нялёгкая атрымалася дыскусія.

Былі крыўды, не зусім джэнтльменскія выпады.

Кожны з прамоўцаў меў сваю рацыю. Яны сутыкаліся, як ільдзіны ў веснавую паводку перад мастом, крышыліся, але не ўступалі адна адной дарогу. Не дапамог і заклік Станіслава Шушкевіча зрабіць крок насустрач інвалідам у пераходны перыяд да сапраўднай дэмакратыі. Закон аб абароне інвалідаў прыняты без артыкула 53, якім прадугледжвалася квота для інвалідаў у Саветах.

Учора раніцай дэпутаты працягвалі разгляд законапраекта аб статусе забруджаных тэрыторый. Да апошняй кропкі дайсці не ўдалося, праект будзе дапрацоўвацца ў пастаяннай камісіі.

Тэматыка ўчарашняга дня атрымалася разнастайнай. Ад чарнобыльскай праблемы дэпутаты перайшлі да жыллёвай, не менш хвалюючай, не менш вострай. Прадставіў законапраект аб прыватызацыі жылля старшыня пастаяннай камісіі Мікалай Капытоў.

Мы добра памятаем, як з Масквы пад адабрэнне рэспубліканскіх кіраўнікоў народу паабяцалі рай у выглядзе асобнай кватэры для кожнай сям'і да двухтысячнага года. Да рубяжа вякоў засталося некалькі крокаў, а даху над галавой многія сем'і не маюць і наўрад ці будуць мець. Дэпутатам добра вядомы астранамічныя лічбы з жыллёвых чэргаў, таму яны з насцярожанасцю прынялі прапанаваны законапраект. Дэпутат Валянцін Вялічка назваў яго спробай збалансаваць фінансавыя цяжкасці за кошт насельніцтва, вызваліцца ад абяцання забяспечыць усе сем'і жыллём да двухтысячнага года. Ён прапанаваў стварыць мінімум свабоднай жылплошчы для пераходу да рынку, захаваць адказнасць урада за забеспячэнне насельніцтва жыллём. А што датычыць прыватызацыі, то пачынаць яе паступова з новых дамоў.

Дэпутат Анатоль Турок засцерагаў ад памылак, якія, на яго погляд, непазбежны, калі разглядаць законапраект аб прыватызацыі жылля асобна ад іншых актаў аб прыватызацыі. Ён мяркуе, што прапанаваны праект вельмі цяжкі ў рэалізацыі. Застаецца затуманеным важнае пытанне, ці будзе дзяржава ў далейшым будаваць жыллё для сваіх грамадзян, альбо гэты вялізарны цяжар ляжа толькі на іх плечы.

Мікалай Лобач знайшоў шмат супярэчнасцей у тэксце, гэта дало яму падставу заявіць, што роўныя правы ў ім толькі прадэкларaваны.

Яўген Радзецкі быў вельмі катэгарычны, ацэньваючы законапраект, маўляў, ён разлічаны на тое, каб як мага больш узяць грошай ад насельніцтва і зрабіць выкуп кватэры для большасці грамадзян рэспублікі недаступным.

Паслухаўшы знішчальную крытыку, некаторыя дэпутаты ўгледзелі ў дыскусіі марнаванне часу. Загучалі прапановы: спыніць спрэчкі, а законапраект адправіць назад у камісію.

Першая спроба і не магла адразу адкрыць шлях да поўнай згоды. Беларусы — небагаты народ (гэта думка гучала ў зале), тоўстых кашалькоў у іх няма, таму дзяржава няхай не разлічвае, што залатае ўсе бюджэтныя дзіркі за кошт продажу кватэр. Тым больш што многія сваім шматгадовым сумленным стараннем за мізэрныя зарплаты ўжо фактычна выкупілі тыя сцены, у якіх жывуць. Дарэчы, якія вельмі далёкія ад міжнародных стандартаў.

Мікалай ГАЛКО.

ЗАЯВА

дэпутатаў Апазіцыі БНФ у Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь

Настае крытычны час для нашай Бацькаўшчыны. 25 жніўня перамаглі дэмакратычныя ідэі Беларускага Народнага Фронту і яго прыхільнікаў, але ўсе структуры кіраваньня, уся ўлада на Беларусі засталіся, як і раней, поўнасьцю ў руках камуністычнай наменклатуры. Савет Міністраў, узначалены былым членам бюро ЦК КПБ Вячаславам Кебічам, бязьдзейнічае і праводзіць вузкую эгаістычную палітыку ў інтарэсах кіруючай групы людзей і былога партапарату, ажыцьцяўляе незаконную прыватызацыю дзяржаўнай маёмасьці, не дбаючы пра народ, яго сацыяльна-эканамічнае становішча, будучыню і суверэнітэт беларускай дзяржавы.

Вярхоўны Савет, які выбраны на недэмакратычнай аснове падчас панаваньня камуністычнай «вандэі», складаецца ў большасьці з былых наменклатурных камуністаў. Ён аказаўся няздольным кантраляваць згубныя для Беларусі дзеяньні ўрада, выпрацаваць канцэпцыю дзяржаўнай палітыкі незалежнай Беларусі, прыняць законы, што адкрылі б шлях да рынку, абаранілі б уласнасьць і дабрабыт беларускага насельніцтва.

Ні Савет Міністраў, ні Вярхоўны Савет, нягледзячы на прапановы дэпутацкай Апазіцыі БНФ, не зрабілі нічога дзеля таго, каб падрыхтаваць выпуск беларускіх грошай, стварыць нацыянальную фінансава-крэдытную сістэму, зрабіць заходы, каб абараніць таварны рынак, пазьбегчы гіперінфляцыі, нястрыманага росту цэнаў, вывазу прадуктаў і прамысловых вырабаў зь Беларусі. Доўжыліся размовы і ашуканства.

У выніку Беларусь апынулася ў хвасьце палітыкі Расеі і балтыйскіх краінаў, стала залежнай ад разбуральных працэсаў у эканоміцы гэтых рэспублік, ад павышэньня цэнаў і эканамічнага шантажу, стала аплачваць цаной працы свайго народа балячкі чужога грамадзтва, жывіць маскоўскіх сьпекулянтаў, паўднёвыя мафіі, рынак Польшчы, Латвіі. Урад не змог забясьпечыць насельніцтва нават па талонах, якія выпусьціў дзеля гарантаванага разьмеркаваньня.

Апазіцыя БНФ лічыць, што неабходна як найхутчэй вызначыць сацыяльную будучыню і статус савецкага войска ў Рэспубліцы, падыходзячы да яго з пазіцый закона і павагі правоў чалавека. Аднак наменклатурны Вярхоўны Савет і Савет Міністраў адмовіліся нават разглядзець пытаньні часовага знаходжаньня Савецкай Арміі на тэрыторыі Беларусі, стварэньня беларускага войска, ваеннага міністэрства і тым самым паставілі рэспубліку перад абліччам вайскова-сацыяльнага абвалу, грамадзкага канфлікту і страты незалежнасьці.

Беларускаму насельніцтву з-за такіх дзеянняў урада пагражае рэзкае пагаршэньне жыцьцёвых умоў, зьбядненьне, страта працоўных месцаў, развал сельскай гаспадаркі. Рэспубліка можа стаць краінай-банкрутам. Беларусь апынулася на парозе сацыяльнага выбуху. І калі такі народны выбух адбудзецца, які б ён ні быў разбуральны для дзяржавы і грамадзтва, абурэньне людзей будзе справядлівым.

Дэпутацкая Апазіцыя Беларускага Народнага Фронту ў Вярхоўным Савеце Рэспублікі Беларусь застанецца заўсёды на баку народа, у якім бы цяжкім становішчы ён ні апынуўся, на баку нашых рабочых, гарадзкіх і сельскіх працаўнікоў, інтэлігенцыі і студэнтаў. Няма ніякага даверу існуючаму ураду В. Кебіча і наменклатурнаму Вярхоўнаму Савету. Апазіцыя БНФ яшчэ ў 1990 годзе запатрабавала роспуску камуністычнага Вярхоўнага Савета, адмовілася галасаваць за гэты Савет Міністраў, прадказваючы яго хуткае банкруцтва. Дэпутаты Апазіцыі Народнага Фронту стаяць у апазіцыі да ўсяго Вярхоўнага Савета, які зросься з пракамуністычным урадам В. Кебіча і трапіў пад уплыў саўмінаўскай наменклатуры.

Наменклатуршчыкі, адчуваючы свой хуткі канец, ліхаманкава ўладкоўваюцца, будуюць і перакупляюць дамы і дачы, прыватызуюць дзяржаўную маёмасьць, фарміруюць капіталы, сумесныя прадпрыемствы і рахункі ў банках, займаюць пасады і цёплыя месцы, каб пры першых жа ўдарах сацыяльнага грому разьбегчыся ў норы, як пацукі з тонучага карабля, у тысячны раз здрадзіўшы сваім абавязкам.

Аднак, калі падымецца хваля народнага пратэсту, мы ўпэўнены, што і дэпутаты Апазіцыі, і ўвесь дэмакратычны рух здолее ўзяць адказнасьць за будучыню Беларусі на свае плечы і дапамагчы грамадзтву выратавацца, выйсьці з крызісу, ажыцьцявіць неабходныя пераўтварэньні.

Першым чынам павінен будзе пайсьці ў адстаўку існуючы ўрад разам з прэм'ерам В. Кебічам. Трэба стварыць новы ўрад — урад народнага даверу. Народ можа атрымаць магчымасьць прымяніць палітычны націск на Вярхоўны Савет, патрабуючы неадкладнага прыняцьця новага дэмакратычнага закона аб выбарах, які даўно ўжо падрыхтаваны Апазіцыяй БНФ, і прызначэньня нечарговых выбараў у прафесійны беларускі парламент.

Калі ж ізноў усё застанецца незразуметым і будзе адкінута, тады можна тэрмінова прыступіць да падрыхтоўкі ўсенароднага рэферэндуму па гэтых пытаньнях — адстаўка ўрада, роспуск Вярхоўнага Савета, нечарговыя выбары, а таксама — перадача маёмасьці КПБ—КПСС—ЛКСМБ народу (дзяржаве) і спыненьне дзейнасьці КПБ—КПСС.

Самы вялікі наш грамадзкі набытак, які ігнаравалі камуністы і не цэніць кіруючая наменклатура — гэта незалежная дзяржава. Маючы незалежную дзяржаву, зьбярогшы і ўсталяваўшы дзяржаўны суверэнітэт, народ можа забясьпечыць сабе сацыяльную, культурную і гістарычную будучыню, ажыцьцявіць эканамічныя і палітычныя пераўтварэньні, памножыць дабрабыт. Мы не павінны дапусьціць разбурэньня грамадзтва і дзяржавы. Каб выйсьці з крызісу, Беларусі неабходна праводзіць палітыку незалежнай краіны.

Нам трэба рухацца да рынкавай эканомікі, усталяваўшы раўнапраўнасьць усіх формаў уласнасьці. Мы павінны пачынаць на гэтым шляху зь вёскі, ратуючы сельскую гаспадарку і сялян, збалансаваўшы падаткі і цэны, гарантуючы законам права ўласнасьці на зямлю і на тэхнічнае забесьпячэньне. Мы павінны праводзіць такую прыватызацыю дзяржаўнай маёмасьці, такі пераход да рынку, які забясьпечваў бы роўныя стартавыя магчымасьці для ўсіх грамадзянаў Беларусі. Мы павінны захаваць наш таварны рынак, эканоміку ад разбурэньня і ўвесьці сваю валюту — беларускі талер, а на падрыхтоўчы перыяд — пераходныя грошы (купоны). Мы павінны ажыцьцяўляць канцэпцыю незалежнай беларускай дзяржавы як свабоднай еўрапейскай краіны. Нам трэба пазьбягаць усялякіх саюзаў і супольнасьцяў, што вядуць да рэанімацыі СССР, да стварэньня унітарнай дзяржавы, да эканамічнай залежнасьці Беларусі, збаўляцца ад вынікаў бальшавіцкага імперыялізму і савецкага каланіялізму. Мы павінны ажыцьцяўляць канцэпцыю актыўнай, партнёрскай, накіраванай ва ўсе бакі міжнароднай палітыкі, каб дасягнуць міжнароднага прызнаньня і супрацоўніцтва. Нам, імкнучыся да нейтральнай бязьядзернай дзяржавы, трэба ажыцьцяўляць сваю палітыку на аснове двухбаковых, а не блокавых пагадненьняў, нам трэба гандляваць.

Ніякая наменклатура, ніякая палітычная ці мафіёзная сіла ніколі не «накарміла» і не «накорміць» народ і нічога яму не дасьць. Задача ў тым, каб даць магчымасьць людзям свабодна працаваць на сябе, распараджацца прадуктам сваёй працы, мець уласнасьць і ўсе правы, абароненыя законам, тады народ накорміць і сябе і грамадзтва, створыць усё, у чым будзе патрэба.

Народныя дэпутаты Апазіцыі БНФ ў Вярхоўным Савеце Беларусі:

З. ПАЗЬНЯК, В. ГОЛУБЕЎ, С. НАВУМЧЫК, І. ПЫРХ, Г. СЯМДЗЯНАВА, Я. НОВІКАЎ, Л. БАРШЧЭЎСКІ, Л. ЗДАНЕВІЧ, С. ПАПКОЎ, В. ГАЛУБОВІЧ, С. АНТОНЧЫК, В. АЛАМПІЕЎ, Б. ГЮНТАР, І. ГЕРМЯНЧУК, М. АКСАМІТ, Л. ДЗЕЙКА, М. КРЫЖАНОЎСКІ, А. ШУТ, П. ХОЛАД, У. СТАНКЕВІЧ, Л. ЗЬВЕРАЎ, С. БАБАЧОНАК, А. ПАРУЛЬ, Я. ГЛУШКЕВІЧ, Г. МАІСЕЕЎ, У. НОВІК, С. СЛАБЧАНКА, А. КАНЦЭВІЧ, В. СЯРДЗЮК, М. МАЦЮШОНАК, Ю. БЕЛЕНЬКІ, Л. ТАРАСЕНКА, Г. ГРУШАВЫ, У. ЗАБЛОЦКІ.

(Друкуецца ў арфаграфіі арыгінала).

АД РЭДАКЦЫІ. Апазіцыя БНФ у Вярхоўным Савеце рэспублікі выступіла з чарговай заявай. Слова, лічым, за ўрадам. Народ павінен ведаць пазіцыю Кабінета міністраў у гэты цяжкі для Беларусі час.

НАРОДНАЯ ГАЗЕТА

В Центральной комиссии по выборам народных депутатов Республики Беларусь

Состоялось заседание Центральной комиссии по выборам народных депутатов Республики Беларусь.

В связи с проведением выборов народных депутатов Республики Беларусь, назначенных на 1 декабря 1991 года в 11 избирательных округах г. Минска и Гродненском — Горьковском № 238, подведены итоги регистрации кандидатов в этих избирательных округах. Комиссия отметила, что в Серебрянском № 3, Грушевском № 14, Голубевском № 16, Академическом № 27, Волгоградском № 28 г. Минска и Гродненском— Горьковском № 238 избирательных округах зарегистрировано по одному кандидату в народные депутаты, а в Аэрофлотском № 20 — 4 кандидата.

Окружные избирательные комиссии по выборам народных депутатов Республики Беларусь Маяковского № 2, Калиновского № 29, Горьковского № 37 отказали в регистрации выдвинутых кандидатур, так как они были выдвинуты с нарушением Закона о выборах, а в Автозаводском № 8 и Луначарском № 38 избирательных округах выдвижение кандидатов в народные депутаты не состоялось.

По всем избирательным округам, где кандидаты в народные депутаты Республики Беларусь не выдвинуты и не зарегистрированы, будут назначены повторные выборы.

Принято также к сведению, что избирательная комиссия республиканского Совета ветеранов Республики Беларусь зарегистрировала кандидата в депутаты от республиканской организации ветеранов вместо выбывшего народного депутата Республики Беларусь.

На заседании комиссии рассмотрены заявления и жалобы. По ним приняты соответствующие решения.

Письма правительству и парламенту

Профсоюзы нам нужны...

Республика вступает в неизведанную полосу рыночной экономики. Растут цены, в магазинах хоть шаром покати, практически не увеличивается зарплата, несмотря на обещания с самых высоких трибун. Кругом обман трудящихся. Зарплата, по данным экономистов, составляет 10—30 процентов от заработанного. Как воздух, нужен республиканский закон «О профсоюзах». По-видимому, давно наступила пора нашему Верховному Совету принять его безо всяких бюрократических проволочек.

Не следует депутатам забывать о том, что вновь испеченные «господа», рассказывающие по радио и телевидению о прелестях рынка, занимаются не только филантропией и благотворительностью. В нашей трудной действительности уже четко прослеживается рыночная тенденция: рабочих выжимают до конца, а потом выбрасывают на улицу.

Плохо верится в то, что воспитанные в нашем обществе будущие хозяева предприятий, ферм, кооперативов, ассоциаций и прочих организаций крепко будут заботиться об интересах рабочих и колхозников. Держи карман шире!

Кто же тогда сможет стать на их защиту?

Только профсоюз.

Главная проблема для человека: нормально жить и работать. И в этом же главная задача профсоюзов. А этого можно добиться только через закон.

Каким быть профсоюзам, какие задачи они должны осуществлять — влиять на экономические процессы, воздействовать на работодателей по созданию безопасных условий труда, снимать социальные напряжения путем переговоров с государственными и хозяйственными органами, частными предпринимателями. Трудящиеся видят профсоюзы гарантом улучшения повседневной своей жизни.

И. ВОЛОТОВСКИЙ,
председатель профкома ПМК-52.
г. Кобрин.

...Но без бывших партаппаратчиков

После позорного ухода КПСС от власти рабочий человек остался один на один с руководителем. Нередко руководителям присуще комчванство, и от него может пострадать рабочий человек. Поэтому считаю, что нужен закон о профсоюзах, чтобы профсоюзы на законном основании защищали труженика, но не лодыря, прогульщика, пьяницу.

Не секрет, что профсоюзы в недалеком прошлом были «кладбищем партийных кадров». Эти кадры КПСС и сейчас руководят профсоюзами. Взять председателя Могилевского облсовпрофа А. Т. Любченко — был комсомольским, потом партийным фукционером, с должности секретаря Могилевского обкома КПБ попал в Афганистан, а по возвращении получил профсоюзную должность.

Партийные функционеры дискредитировали партию, теперь могут до конца дискредитировать и профсоюзы.

Считаю, что в законе должно быть оговорено, что на профсоюзные должности не могут попадать бывшие партфункционеры, нужно открывать свою высшую школу профактива.

М. САДОВСКИЙ.
г. п. Белыничи.

Черное крыло Чернобыля

Это не по-человечески...

Не думал, что жизнь заставит на склоне лет писать жалобу. Никогда этим не занимался, а теперь просто не выдержал...

Я инвалид войны I группы, живу с женой в деревне Лубень. Постарели мы уже, нет сил и здоровья вести хозяйство. Многие давно покинули здешние места, спасаясь от радиации. Мы никуда не хотели уезжать, да вот приходится.

Обратился я в Наровлянский горсовет с просьбой прописать нас к старшему сыну. И что вы думаете? Нам отказали... Обидно стало, потому что это не по-человечески. Город сейчас полупустой, неужели бы не нашлось нам уголка. Районное начальство устроило своих родственников, вывезло подальше от беды, а нам, выходит, не положено...

Петр ЦАЛКО.
Наровлянский район.

Роздум

Здаровы сэнс возьме сваё

Мы ўжо так шмат нагаварылі пра рынак, што, здаецца, даўно яго прайшлі. Як прайшлі камунізм у 80-я гады. Непрыкметна. Але калі азірнешся, дык на сённяшні погляд, быццам нешта было. Якісьці міраж. Колькі разоў мы праходзілі ўжо гэтыя міражы. А ўсё ніяк не навучымся адрозніваць іх ад рэальных абставін. І ляцім на іх, як матылі на святло. Кожны раз шукаючы паратунак. Не, не сабе, кожны раз манячы сабе, спрабуем абараніць сістэму, якая даўно ўжо не працуе. Якая абняславіла, і, мусіць, зжыла сябе.

Крыху раней, ды, відаць, і зараз многія разумелі і разумеюць рыначную эканоміку пасвойму. У большасці звязваюць яе толькі з павышэннем цэн. Упэўнена, што рыначнай эканомікі (а яе не трэба блытаць з базарам ці «чорным рынкам») не можа быць, калі няма тавару, няма свабоднага прыватніка. Рынак жа мае на ўвазе канкурэнцыю. А хто, прабачце, з кім будзе канкурыраваць? Дзве семачніцы на базары? Ці тыя, хто перапрадае дзяржаўныя тавары? Хто даражэй прадасць? Не відаць дасюль і асаблівага імкнення ствараць рынак. Пакуль што толькі размовы. А паспрабуй заікніся селянін пра кавалак зямлі, знойдзецца сотня прычын не даць.

Калі стваралі калгасы, дзейнічалі актыўна, амаль што сілаю. На сяло прыйшлі «тысячнікі» — лепшыя прадстаўнікі рабочага класа.

А дзе зараз тыя людзі, хто паспрыяе селяніну? Вось і збіраюцца на з'езды нашы Бядулі і Старавойтавы запэўніць адзін аднаго і паспачуваць адзін аднаму, што сяляне не бяруць зямлю. Ды хто ж возьме з голымі рукамі? Калгаснік жа батрак — у яго ні сродкаў, ні тэхнікі. А пабудуйце вы фермы, ды дайце ў выкуп ці растэрміноўку людзям — возьмуць. Яшчэ як! А яшчэ замінае думка, што ў нашу свядомасць як цвік увагнана, — будзеш працаваць, сілу і жыццё пакладзеш, а потым — забяруць. Вельмі развілася ў нас гэта звычка — адымаць і дзяліць. І грамадства, як дзёгцем, пранізана пачуццём зайздрасці, атрутай роўнасці: «А-а-а, ты хочаш жыць лепей — не атрымаецца, жыві як я».

Так, шмат што мы забыліся, знаходзячыся пад гіпнозам нашых ідэй, згубілі разумны, здаровы сэнс. Прыдумлялі розныя праграмы і прымалі пастановы. Чаго варта праграма пабудовы камунізму, харчовая праграма, выкананне якой было разлічана на 1990 год. З жыллёвай праграмай — ужо відавочна — будзе таксама тое ж. І цяпер пасля ўсіх гэтых падпорак сістэмы, калі нашы кіраўнікі раяць народу зацягваць паясы.

Выжыць... Якое агіднае слова. Нібы мы ў пустыні, ці сярод акіяна на хісткіх плытах. Выжыць... Ці не насмешка гэта над намі, над нашым характарам, які наша родная сістэма і яе паслугачы самі ж стварылі больш як за семдзесят гадоў сваёй улады, падаўляючы індывідуальнасць чалавека,ператвараючы яго ў паслухмяную, рахманую істоту. Радуе адно: здаровы сэнс бярэ сваё. Як ні адбіваліся мы ад гэтага, здавалася, чужога слова «прыватызацыя», як не палохалі і палохаліся, што гэта вяртанне да капіталізму, здаровы сэнс бярэ сваё.

Ніна МАЕЎСКАЯ,
пісьменніца.

Реплика юриста

Был ли подарок?

1 ноября в вашей газете, постоянным подписчиком которой я, кстати, являюсь с момента ее основания, опубликован депутатский запрос Генеральному прокурору республики под интригующим заголовком: «Подарок?» Речь в нем идет о выделении квартиры в г. Минске народному депутату СССР, секретарю ЦК КПБ А. А. Зеленовскому. Затрагивается и моя скромная особа как юриста, подписавшего справку, «... из которой следует: поскольку А. Зеленовский избран на выборную должность, то ему положено жилье вне очереди».

Прочитав запрос, непосвященный человек непременно подумает: ага, по-прежнему партократам все льготы и привилегии, повсюду «зеленая улица». А еще говорят о равенстве всех перед законом, о каком-то правовом государстве...

И читатель будет иметь основания для такого вывода, если, конечно, примет за чистую монету приводимые в публикации утверждения. В частности, о том, что жилплощадь была выделена в соответствии (цитирую по тексту) со «...сталинским законом для партбоссов...». Заботясь об истине, не могу оставить без внимания это, мягко говоря, некорректное заявление.

Во-первых, нет законов сталинских и брежневских, а есть действующие и утратившие силу. Постановление ЦИК и СНК республики от 15 июня 1933 года не отменено и применяется по сей день. Кстати, оно подписано А. Г. Червяковым, безвинно погибшим в годы репрессий.

Во-вторых, указанное постановление предоставляет право на дополнительную жилплощадь не партбоссам, а научным работникам (А. А. Зеленовский — кандидат экономических наук).

В-третьих, правило о внеочередном предоставлении жилья лицам, избранным на выборную должность не по месту своего постоянного жительства, создано не для КПБ. Оно распространяется на граждан, занявших должность по выборам в любом государственном, профсоюзном органе, политической партии, другой общественной организации и БНФ в том числе.

В этой связи считаю необходимым заявить: если, паче чаяния, будет необоснованно отказано в предоставлении жилья кому-либо из народных депутатов республики, готов оказать им посильную правовую помощь, не спрашивая о национальности, вероисповедании и политических убеждениях.

Валентин БОРОВЦОВ,
заведующий юридическим отделом Управления делами Совета Министров Республики Беларусь.

***

Публикуя письмо В. Боровцова, редакция «Народной газеты» вовсе не думает, что оно каким-то образом повлияет на исход депутатского запроса. У нас нет оснований не печатать комментарий должностного лица Совмина, как и не было оснований не помещать письмо депутатов.

Читателям сообщаем: Генеральный прокурор Республики Беларусь Н. И. Игнатович пока так отреагировал на запрос народных депутатов С. А. Антончика, И. Н. Герасюка, О. А. Трусова:

«В связи с вашим депутатским запросом, опубликованным 01.11.91 г. в «Народной газете», сообщаю, что Прокуратурой Республики Беларусь начата проверка по факту предоставления квартиры в г. Минске секретарю ЦК КПБ Зеленовскому А. А.

После изучения всех документов, касающихся этого вопроса, Прокуратурой республики будет принято решение в соответствии с действующим жилищным законодательством, о чем вы будете уведомлены дополнительно».

Надеемся, наши читатели также будут проинформированы о результатах депутатского запроса.

І прачнёмся ў багатай краіне?



Фота Аркадзя Бірылкі.

Ідзём да рынку

Прыватызацыя: шлагбаум падняты

Рэспубліканскі Закон аб прыватызацыі даспее да патрэбнай кандыцыі, відаць, толькі да наступнай сесіі парламента. Але ўрадам ужо зацверджаны пакет дакументаў, які адкрывае шлях працэсу раздзяржаўлення эканомікі. Часовы парадак, прыняты Саветам Міністраў, будзе дзейнічаць да прыняцця закону. У пераліку прадпрыемстваў, якія падлягаюць прыватызацыі ў першую чаргу, каля 300 назваў. Сярод іх такія вядомыя ў Беларусі, як ВА «Ваўкавыскцэменташыфер», Мінскае ВА імя Крупскай, рэспубліканскі Дом мадэляў, Маладзечанскае НВА парашковай металургіі і да т. п. Гэты пералік, па сутнасці, складзены з заявак калектываў, якія хочуць выйсці з-пад дзяржаўнай апекі і самастойна выбраць новую форму ўласнасці. Часцей за ўсё шляхам арэнды з правам выкупу ці пераўтварэння ў акцыянернае таварыства.

У Беларусі сёння ёсць першае і пакуль адзінае народнае прадпрыемства. Калектыў мінскага спецыялізаванага будаўніча-мантажнага ўпраўлення № 1 у канцы верасня атрымаў у Дзяржкаммаёмасці Рэспублікі Беларусь першае «Пасведчанне аб уласнасці». Паўтары тысячы работнікаў сталі ўладальнікамі свайго прадпрыемства, выплаціўшы 828 тысяч рублёў.

Наступныя пасведчанні аб уласнасці атрымаюць, хутчэй за ўсё, калектывы гродзенскай абутковай фабрыкі «Нёман», ВА «Бабруйскдрэў», Драгічынскага завода медпрэпаратаў і вырабаў, які будуецца, прадпрыемстваў Ваўкавыска і Пінска. Менавіта па гэтых адрасах працуюць зараз прыватызацыйныя камісіі.

Ігар ФІЛІПЕНКА.

Задумаемся...

ЖИВЫЕ И МЕРТВЫЕ

На костях своих и чужих построили мы страну Иванию, не помнящую родства

— СТОРОЖ наш, — хохотнул парень из бригады.

Юмор был строительный, ядреный.

Со свежесмонтированного фундамента окрестности озирал человеческий череп.

Несколькими месяцами раньше, получая наряд на новый объект, рабочие подумать не могли, что на все управление прослывут могильщиками. Проект новой школы в Дубровском микрорайоне Бреста оказался посаженным на неизвестное захоронение.

Поначалу спокойно себя чувствовал только железный экскаватор, каждый зачерп которого приносил тогда еще сюрпризы: черепа, кости, кости, черепа... Строители не выдерживали, выскакивали из траншей, людей мучительно рвало. Но притупило время восприимчивость, прошел и всплеск спорливости, и говорили теперь рабочие спокойно, к усопшим сочувственно, к начальству ругательно, но без злобы, как по инерции...

КЛАДБИЩА, как люди, имеют свою молодость, старость, смерть. Время безжалостно и к ним.

До прихода строителей был здесь никому не интересный, пустующий кусок земли. Пустырь как пустырь, исполосованный, правда, какими-то вспученными грядами. О покоящихся здесь останках власти могли просто не знать.

Могли не знать, однако знали. Участок под школу отвели в конце 1987 года, строительство начали в девяностом. А в 1989-ом специальным решением горисполкома обязали жилкомхоз произвести перезахоронение. Тот приступать к исполнению благоразумно не торопился. Горисполком благоразумно не настаивал.

Как нормальных советских столоначальников всех причастных к строительству интересовало исключительно «можно-не можно» в свете инструкций. Городская архитектура обратилась с запросом в областной архив, краеведческий музей, общество охраны памятников. Ответы гласили, что такое кладбище в списках не значится.

Стройку запустили.

Вскоре обнаружилось, что захоронение нешуточное, и по городу пошел шум. Горисполком составил комиссию с участием УКСа, санэпидемслужбы, архитектуры, ритуального бюро. Разумеется, прежде всего комиссию интересовали вопросы материальные, а не духовные, в частности, время последнего захоронения, чтобы сопоставить с инструкциями.

Отечественные инструкции — явление уникальное. Их — что цитат у известных авторов — обилие и разнообразие, не составляющее труда сделать подборку под любое решение. Но мало того, хватает бумаг, которые и отдельно взятыми имеют сутью «нельзя, но если очень хочется...» В прошлом году пришедшая республиканская инструкция разрешает ликвидацию закрытых кладбищ не ранее чем через 50 лет после последнего захоронения. И тут же делает оговорку, что в исключительных (?) случаях срок можно скостить до 25 лет.

Комиссия, естественно, установила, что срока давности хватало. Сделав в проекте небольшие корректировки и нарядив двух парней с «похоронки» собирать черепа (четвертной за штуку), строительство велели продолжать.

Докапываться, что за кладбище и кто здесь похоронен, сочли заботой лишней, к сути не относящейся.

МИКРОРАЙОН вырос после войны, и народ здесь живет больше приезжий. Но с другого конца примыкает давшая ему имя деревня Дубровка, поселение старинное.

Стучать пришлось в дверь, окно, снова в дверь. Благо, предупредили: бабка Дарья очень древняя и живет одна.

— Кладбище? Так давнее оно, кладбище-то, — перекрестилась бабушка. — Когда молодая была, старики рассказывали, что немецкое оно, но не с последней войны— раньше.

С каждым новым рассказом дубровских стариков все яснее вырисовывается история кладбища редкого, наполеоновских времен. Век спустя стало оно последним пристанищем и для солдат первой мировой. В те времена идеология до мертвых еще не добралась: немцев, французов, поляков, русских хоронили рядом.

Кладбища, как люди,— умирая, уносят в могилу тайны. На окраине дубровского кладбища располагались братские захоронения, и дожди частенько вымывали детские черепа — зверство ли какое было, эпидемия ли? Еще поговаривают, что свозили сюда тела сталинские подручные, но шансы газетчика добыть документальные подтверждения таким фактам и сегодня близки к нулю.

МОЖЕТ, горькая случайность — происшедшее с вековым дубровским кладбищем? Может, исключение?

В середине сороковых, вскоре после освобождения, за другой окраиной Дубровки был разбит в поле лагерь немецких военнопленных. Рядом возникло кладбище, простенькое и быстро росшее.

Годы спустя, отработав положенное победителями, немцы смогли вернуться в фатерланд. Живые. Умершие остались здесь, в дубровской земле.

Стала ли великим примирителем смерть?

Несладка доля солдата. Надев форму, он перестает принадлежать себе, над ним встают устав, приказ, чьи-то расчеты. Единственный на войне выбор—стать героем или подлецом. В отношении своих.

Чужих на войне солдату приходится убивать.

В отношении похороненных близ Дубровки немецких военнопленных Брест поначалу был великодушен. Оставленное живыми соплеменниками немецкое кладбище не осталось без ухода. Власти даже нашли возможным оплачивать труд смотрителя — местного старика. После смерти обязанности и приработок перешли к его дочери.

Лизавету Степановну, последнюю из смотрителей, удалось разыскать не сразу. Рассказывать что-либо она по неизвестной причине наотрез отказалась.

— Идите к начальству, сочтут нужным, расскажут. А от меня отстаньте.

Из Лизаветы Степановны, кстати сказать, люто немцев ненавидящей, удалось вытянуть, что деньги на содержание кладбища платил облисполком. Порядок аккуратно фотографировался для успокоения западногерманской родни. Приехать родственникам не разрешали, очевидно, опасаясь шпионажа. Потом плату то ли уменьшили, то ли совсем отменили, и Лизавета Степановна смотреть за кладбищем перестала. О происходившем после никакими ухищрениями добиться от нее было нельзя.

А учинили потом вот что. Кладбище было придумано перепрофилировать в свалку, на которую свозился городской мусор. Просуществовала свалка год-другой, потом пришли бульдозеры, и не осталось ничего.

Тогда же кощунство властей дополнилось кощунством отдельно взятых граждан. Прихватив лопаты, на могилы пошли мародеры...

ГОТОВЯ этот материал, не раз слышал от должностных лиц знаменитое «ты не прав». Не прав, потому что надо думать о живых. Не прав, потому что на костях, в общем-то, построено пол-Бреста.

Первое — правда: давно не мешало подумать о детях Дубровки, занимающихся в старой школе в три смены и две подсменки. Правда и второе. Центр города, в годы оккупации превращенный в еврейское гетто, был испещрен братскими могилами, по освобождении ставшими строительными площадками новых кварталов. На месте кладбища 1812 года ныне возведен водозабор, старое еврейское кладбище стало стадионом «Локомотив»...

Случались вещи и почище. Есть свидетели тому, как, выполняя приказ, взвод наших солдат ночью разрушал маленькое кладбище умерших в госпиталях... красноармейцев.

А сегодня?

Под гаражи облюбовано еще одно старинное кладбище, с могилой русского генерала наполеоновской войны. Та же судьба, похоже, уготована месту последнего боя героя Брестской крепости...

КЛАДБИЩЕ наполеоновское. Кладбище пленных немцев. Кладбище наших. А участь одна — забвение.

Пройдет время — и также забудут, затопчут, застроят многих из нас?

Василий САРЫЧЕВ.
г. Брест.

А что на Витебщине?

В память о матери поэта

В большой праздник двух братских культур— латвийской и белорусской — превратилось открытие мемориального знака на Старо-Семеновском кладбище в Витебске, где в 1914 году была похоронена Дмарта Плиекшане — мать великого поэта Латвии Яна Райниса.

Вместо монумента использован сохранившийся с ледникового периода гранитный балтийский валун. Его нашел в окрестностях города витебский краевед Николай Плавинский. Доску с надписью на двух языках и рельефным изображением, символизирующим один из мотивов лирики Райниса, изготовил известный рижский скульптор Вилнис Титанс. В торжествах приняли участие латвийские и белорусские литераторы, артисты, ученые-литературоведы, хоровая капелла из Даугавпилса, школьники из двух республик. Многое сделали для организации вечера витебские работники культуры, энтузиасты белорусско-латвийских связей, уходящих в глубокую древность. Кстати, как выяснилось, среди предков матери Райниса были представители белорусского рода Грибовских! Как раньше сплетались корни народов, так ныне сплетаются молодые ветви их культур...

Оригиналы пока недоступны

Помощь в оформлении Дома Марка Шагала в Витебске оказала дирекция знаменитой художественной галереи «Ширн-Кунстхалле» из Франкфурта-на-Майне, где состоялась выставка произведений всемирно признанного художника

В дар его родному городу направляется большая серия цветных репродукций работ Шагала, представленных во франкфуртской экспозиции. О приобретении оригинала хотя бы одной из этих работ для Витебска пока и речи быть не может — настолько высока их цена. А ведь было время, когда художник с радостью отдал бы землякам свои произведения бесплатно! Но тогда для нас он был чужим...

Без «прозрачной валюты» не ступишь ни шагу...

Если верить статистике, жители Витебской области стали пить больше, чем в «застольный» период. В этом году им продано уже 11,5 миллиона литров водки, что на 28 процентов превосходит уровень 1984, последнего доперестроечного года.

Но статистика не учитывает (и не может учесть), какое количество спиртного вывозится в другие республики и за рубеж, чего раньше почти не было. Добавьте сюда тысячи лишних и поддельных талонов, торговые махинации и то, что «прозрачная валюта» стала желанным товаром даже для закоренелых трезвенников, и вы поймете: 900 граммов водки на человека в месяц (а именно столько продается по талонам) — не так уж много. Тем более, что вина на Витебщину поступает в три с лишним раза меньше, чем до борьбы с алкоголизмом.

Знал бы пан Буховский...

Новую жизнь бывшему дворцу пана Буховского в Лынтупах обещают строители и реставраторы.

На восстановление изящного, но предельно запущенного здания Поставский райотдел культуры раздобыл миллион рублей. После завершения работ в дворцовых интерьерах разместятся краеведческий музей, музыкальная школа. Предполагается и возрождение бывшего господского парка, об утраченном великолепии которого рассказывают старожилы поселка.

На «подножные» лекарства

Нет худа без добра. Так говорят жители Чашников, перешедшие от традиционных таблеток к настоям из лекарственных трав, изготовленных фармацевтами местной аптеки.

Открытый здесь утренний фитобар пользуется, пожалуй, почти такой же популярностью, как вечерний ресторан. Понятно, с большой разницей в результатах.

Дефицит фабричных лечебных средств привел к возрождению народных. Первыми в республике аптекари области поставили это дело на солидную основу. К фитобару в Чашниках прибавились два витебских, новополоцкий и новолукомльский.

Сергей БУТКЕВИЧ.

Народная газета



ЗАРУБЕЖЬЕ

⊙ ТАСС ⊙ «Народная газета» ⊙

Реэкспортеры подержанных «Лад»

По приблизительным подсчетам, в этом году более 10 тысяч подержанных автомобилей отечественного производства возвратились своим ходом из Финляндии в СССР. За рулем чаще всего сидели советские автолюбители. Статистики по такому «реэкспорту» в Финляндии никто не ведет, так как по местным законам на товар, приобретенный на сумму менее 10 тысяч марок, заполнять экспортную декларацию не требуется. Однако на границе финские пограничники или таможенники фиксируют номера машин и сообщают их в центр регистрации автотранспорта для снятия с учета. По данным центра, и можно судить о масштабах нового вида «восточной» торговли автомашинами. Так, в прошлом году в Финляндии было снято с учета 17.997 «Лад», 1.146 «Москвичей» и 40 «Волг».

Бывает, что в день границу в направлении Советского Союза пересекает до тридцати машин, говорят пограничники одного КПП. Нередко к границе очередную «Ладу» подгоняет финн, а на советской стороне ее встречает заказчик. В наибольшей степени перегружен таким транзитом контрольно-пропускной пункт в Ваалимаа. Через него в этом году вернулись на родину 5 тысяч «Лад». Не менее интенсивно идет транзит с помощью паромов, курсирующих между Хельсинки и Таллинном.

